З нагоды свята

# У чарзе па беларускамоўную кнігу

## Трэба было чакаць па дзве-тры гадзіны

**Аб гэтым сведчыць «Палеская праўда», датаваная 1928 годам, калі гаворка ідзе аб Гомельскай бібліятэцы імя Герцэна. Сёлета ў красавіку яна адзначае свой 100-гадовы юбілей. Прыгожая лічба, за якой драматычная, а часам і трагічная гісторыя — перажытая разам з краінай і цалкам адданамі бібліятэчнай справе супрацоўнікамі.**

### Бібліятэчны канфіскат

Стагоддзе таму, 10 красавіка 1919 года, у доме № 59 па вуліцы Замкавай (цяпер гэта праспект Леніна) адкрылася цэнтральная бібліятэка. У фондзе былі выданні на іўрыце, рускай, польскай, французскай і нямецкай мовах.

За першы год работы было зарэгістравана звыш васьмі тысяч чытачоў, а самай вялікай папулярнасцю і тады карысталася белетрыстыка. Яе было няшмат, таму кожную такую кнігу чыталі за год 8-9 разоў. У першае дзесяцігоддзе існавання ўстанове культуры катастрафічна не хапала кваліфікаваных кадраў. Тым часам, расказвае **архівіст Марыя АЛЕЙНІКАВА,** у 1920-я гады сюды паступілі на закрытае захоўванне агітацыйныя кнігі і брашуры дарэвалюцыйнага перыяду, якія былі канфіскаваныя з вучылішчаў і прыватных бібліятэк:

— Цікава, што сярод іх былі заканадаўчыя акты ўстаноўчага сходу, літаратура па ўсеагульным выбарчым праве, духоўная літаратура, кнігі манархічнага зместу і парнаграфічная літаратура. Гэтыя выданні захоўваліся ў спецыяльных шафах і выдаваліся толькі па дазволах. Дарэчы, у 1930-я гады мінулага стагоддзя адбылася чыстка бібліятэк і з іх масава канфіскавалі тыя кнігі, якія знаходзіліся на закрытым захоўванні. Фонд бібліятэкі тады паменшыўся на шасці тысяч адзінак.

### Імем публіцыста і рэвалюцыянера

Рух бібліятэк-перасовак, які павінен быў ахапіць масы ведамі, закрануў і гомельскую цэнтральную бібліятэку. Звычайна справа арганізоўвалася такім чынам: прыкладна 200 кніг выдаваліся на адзін месяц на адно з прадпрыемстваў ці арганізацый горада. У 1923-м было ўкамплектавана пяць такіх перасовак: для цукерачнай фабрыкі «Прасвет», піўзавода «Спартак», дзяржмлына «Чырвоны млынар», Дома селяніна, завода «Рухавік рэвалюцыі».



Бібліятэка імя Герцэна сёння.

З 1925 года ўстанова ўпершыню згадваецца як Цэнтральная губернская бібліятэка імя Аляксандра Герцэна. Ёсць меркаванне, што яго імя было прысвоена ў сувязі з 55-годдзем з дня смерці рускага рэвалюцыянера-публіцыста.

З памяшканнем, а таксама і з прафесійнымі кадрамі ў гэтай бібліятэцы, як і ў іншых, усё было дрэнна. Настолькі, што нарэшце гэта было заўважана ўладамі. І тады ў чэрвені 1935 года выйшла пастанова ЦК КП(б)Б «Аб стане бібліятэчнай справы ў сістэме Наркамасветы БССР», у якім звярталася ўвага мясцовых улад на іх безадказнае стаўленне да стварэння неабходных умоў для звычайнай работы бібліятэк. Пасля рэкамендацыі выдзеліць для бібліятэк памяшканні, а таксама знайсці сродкі на рамонт, закупку новага абсталявання і літаратуры для Герцэнкі ў 1938 годзе знайшлі месца ў двухпавярховым будынку па вуліцы Камсамольскай, 67. На першым паверсе размясціўся абанемент, на другім — чытальная зала і кабінет загадчыка. У памяшканнях былі паркетныя падлогі, засланыя дыванамі, вазы з партрэтамі пісьменнікаў, карціны мастакоў, прыгожыя люстры і люстэркі...

### Кватэры для кніжак

Зусім хутка Вялікая Айчынная вайна прымусіла забыць пра ўвесь бібліятэчны дабрабыт, які толькі пачаў наладжвацца ў пачатку 1940-х. Між тым фонды ў той час налічвалі звыш 70 тысяч кніг, чытальная зала была абсталявана на 106 месцаў. Кнігі, як і абсталяванне з многіх гомельскіх прадпрыемстваў, эвакуявалі ў Казань. Але ж назад вярнулася зусім няшмат — тое, што пасля вызвалення горада над Сожам у лістападзе 1943 года са сталіцы Татарскай АССР змагла прывезці тагачасная загадчыца Надзея Чумбурава.

Бібліятэка адраджалася амаль з нуля. У красавіку 1945-га яна размяшчалася ў будынку па завулку Пушкіна, 3 — у пакоі плошчай 35 квадратных метраў. З абсталявання: чатыры стэлажы, этажэрка для часопісаў і газет, два сталы, шэсць зэдлікаў, дзве вітрыны. Палову з 10 тысяч кніг сабралі яе чытачы. Паколькі літаратуры на ўсіх не хапала, супрацоўнікі не толькі насілі кнігі на буйныя прадпрыемствы горада, але і практыкавалі чытанне мастацкай літаратуры па радыё.

Пытанне пра будаўніцтва памяшкання для бібліятэкі паднімалася штогод, аднак станоўчага рашэння не было. У 1953-м пад бібліятэку была выдзелена камунальная кватэра ў жылым доме № 2 па вуліцы Леніна (цяпер Камсамольская), плошчай 61 квадратны метр. Праз чатыры гады ў двух пакоях кватэры і ваннай змяшчалася 35 тысяч кніг. У пакоі плошчай 16 «квадратаў» знаходзілася чытальная зала на 20 месцаў, а ў кухні — абанемент.

### Прытулак для пісьменнікаў

Толькі ў канцы 1961 года бібліятэка імя Герцэна пераехала ў новае памяшканне па праспекце Леніна, 12. Ста дзевяноста квадратных метраў хапіла на чвэрць стагоддзя. А ў трагічным чарнобыльскім 1986 годзе адбылося перасяленне ў суседні будынак па праспекце Леніна, 18. Там, на першым паверсе жылога дома, пачаў сваю дзейнасць літаратурна-мастацкі салон «Сустрэчы на Замкавай», які і дагэтуль збірае творчую інтэлігенцыю горада над Сожам. Ва ўтульнай атмасферы імправізаванай кавярні аматары мастацтва сустракаюцца з гомельскімі пісьменнікамі, слухаюць у аўтарскім выкананні творы, абмяркоўваюць іх.



ПО ГОМЕЛЮ

Яшчэ пра бібліотэку імя Гэрцэна

Каб атрымаць з бібліотэкі імя Гэрцэна беларускую кнігу, трэба гадзіны дзьве-тры чакаць сваёй чаргі.

А калі ня маеш часу, дык вьвернешся з пустымі рукамі.

Няўжо нельга наладзіць такі парадак, каб кнігі на беларускай мове даваць па асобнай чарзе.

Гэта зараз-жа падштурхне прасоўваньне беларускіх кніг

Чытач.

«Палеская праўда», 1928 год.

Падрыхтоўка да цэнтралізацыі бібліятэчнай сеткі завяршылася 1 кастрычніка 1977 года. У склад Гомельскай гарадской цэнтралізаванай бібліятэчнай сістэмы ўвайшлі 18 гарадскіх бібліятэк. Іх усе аб'ядноўвае цяпер Герцэнка.

### З новымі тэхналогіямі ў наступнае стагоддзе

12 верасня 2009 года Гомельская гарадская бібліятэка імя Герцэна зноў перасялілася — на вуліцу Савецкую. Цяпер у адрэстаўраваным гістарычным будынку № 26 — сучасны прасторны камп'ютарызаваны храм асветы. Камфорт і інфармацыйныя тэхналогіі кардынальна змянілі магчымасці бібліятэкі, падкрэслівае **дырэктар ДУ «Сетка публічных бібліятэк горада Гомеля» Таццяна УЛАСАВА:**

— Мы змаглі стварыць мультыкультурны цэнтр. Мы значна пашырылі не толькі інфармацыйныя магчымасці бібліятэкі, але і стварылі камфортныя ўмовы для вольнага часу. Бібліятэчны супрацоўнік імкнуцца да таго, каб атмасфера ў нас панавала асаблівая. І гэта атрымліваецца. Мы займаемся тут выставачнай дзейнасцю, у нас ёсць музей аўтографа. Сярод яго рэдкіх экспанатаў — аўтографы касманаўта Юрыя Гагарына, маршала Сямёна Будзённага, рэжысёра Кшыштафа Занусі... Віртуальныя сэрвісы мы прапануем праз свой сайт. У сацыяльных сетках прасоўваем многія праекты і акцыі. У далейшым, здаецца, наша ўстанова будзе ўяўляць нейкі сімбіёз віртуальных сэрвісаў і рэальных стасункаў у сценах бібліятэкі — у тым ліку з папяровай кнігай на традыцыйных носьбітах. Між іншым, назіраем тэндэнцыю: людзі пры наяўнасці стасункаў віртуальных хочуць рэальных. Я ўпэўнена, што кніга на традыцыйных носьбітах нікуды не знікне з нашага жыцця.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**



# ПАЎМІЛЬЁНА СОСНАЎ НА ШАСЦІ СОТКАХ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Звычайна пасадачны матэрыял вырошчваецца ў адкрытым грунце, але нядаўна тут сталі практыкаваць цяплічны варыянт. І значна выйгралі. Як паведаміў **галоўны ляснічы лясгаса Віталь БРЭЙВА,** выхад сеянцаў і саджанцаў павялічыўся ў тры разы. Адпаведна, зменшыліся і затраты. Напрыклад, у адной цяпліцы можна вырасціць паўмільёна сосначаў на плошчы ў шэсць сотак. У адкрытым грунце гэта заняло б 25 сотак.

Яшчэ адна цяпліца адведзена пад елачкі. Ім тут ужо па два гады, але высаджваць у лес яшчэ рана. Для больш хуткага росту верх цяпліцы зацэменены спецыяльным тэнтам. Хвойныя пароды, як вядома, не любяць гарачага надвор'я і прамых сонечных промняў. Тым не менш новыя пасадкі больш устойлівыя да пацяплення клімату. Падрыхтоўкай насення займаецца як сам лясгас, так і шчучынскі цэх, куды паступае матэрыял з усёй Гродзенскай вобласці.

У цэлым лес узнаўляецца пародамі, якія лічацца карэннымі для Беларусі, — гэта бяроза, асіна, сасна, елка, дуб, вольха і іншыя. Таксама пачала распаўсюджвацца лістоўніца.

— Склад лесу не змяняецца, — тлумачыць Віталь Брэйва. — На кожным участку фарміруюцца тыя пароды, якія раслі да таго, як тут адбылася прамысловая ці санітарная высечка. Альбо высах ельнік. Стаіць задача — захаваць натуральны лясны склад. Гэта работа вядзецца згодна з праектам, які складаецца на 10 гадоў. У кожнага ўчастка ёсць свой «пашпарт» і пад яго высаджваюцца драўняныя пароды. Каб лес быў якасны, і створаны наш гадавальнік. Які будзе пасадачны матэрыял, такі і будзе лес.

І справа гэта не хуткая. Спелым лічыцца той лес, якому пад 100 гадоў. І хоць Іўеўскі раён — адзін з лясістых (плошча лесу тут складае 46 %), работа па ўзнаўленні вядзецца актыўна. Яно і зразумела, бо тое, што садзіцца зараз, — гэта задзел для будучых пакаленняў. У сучасных умовах трэба ўлічваць і клімат.

У лясгасе пакуль не бяруцца рабіць прагнозы па стане ельнікаў на гэты год. Візуальна ўсыханне назіраецца менш, чым летась, канстатуе Віталь Брэйва. Лес нядрэнна выйшаў з зімы, летась аслабленых дрэў было значна больш. Але пры засусе ці караедах узнаўленне лесу будзе весціся яшчэ больш узмоцнена.

Дзякуючы цяпліцам, пасадачным матэрыялам забяспечваюцца і іншыя лясгасы. Хапае і на тое, каб прадаць за мяжу. Беларускімі сеянцамі ўзнаўляюцца і расійскія лясы. Днямі зялёны тавар адправілі ў Смаленск. А ўсяго летась у Расійскую Федэрацыю прададзены адзін мільён сеянцаў елак на 62 тысячы рублёў.

А яшчэ ў гадавальніку займаюцца вырошчваннем дэкаратыўных відаў. І попыт на іх толькі расце. Напрыклад, горад набывае ліпы, бярозы, рабіны, вербы. Шырокае распаўсюджванне атрымалі ядлаўцовыя віды, кізілавыя, барбарысы, якім можна прыдаць розную форму. Такімі раслінамі больш цікавяцца мясцовыя жыхары, якія займаюцца азеляненнем сваіх двароў. Усё больш папулярнымі ў насельніцтва становяцца хвойныя дрэвы, якія ачышчаюць паветра ад бактэрый сваімі фітанцыдамі. Многія сталі садзіць каля дамоў яліны — канадскія альбо блакітныя, каб упрыгожваць іх на Новы год. Усяго ў гадавальніку вырошчваецца каля 80 відаў раслін — кустоў і дрэў. Каб знайсці нешта новае, работнікі лясгаса выязджаюць у іншыя гадавальнікі ці Батанічны сад.

— Зараз многія цікавяцца бэзам — гэты хмызняк набывае папулярнасць паўсюдна. Таксама пытаюць пра язмін садовы, — расказвае **начальнік гадавальніка Наталля ЖАМОЙТА.** — Бось і шукаем, дзе магчыма. Часта звяртаемся ў Батанічны сад. Чаранкавалі там каля тысячы саджанцаў. Потым у сябе разводзім. Калі людзі бачаць такія цудоўныя расліны, прычым розны формы, многія хочуць упрыгожыць імі свае сядзібы.

**Маргарыта УШКЕВІЧ, фота аўтара.**